# Дасягненні 2020/2021 навучальнага года

У 2020/2021 навучальным годзе вялася сур'ёзная **работа педкалектыву з высокаматываванымі навучэнцамі.**

Былі пададзены 2 заяўкі на раённы фестываль даследчых работ дзяцей дашкольнага і малодшага школьнага ўзросту “Я – даследчык” (Язневіч Марыіта, ІІ клас, настаўнік Навуменка Г.І., і Сакалоўскі Іван, IV клас, настаўнік Мурашка А.В.). Праца педагогаў і вучняў адзначана пасведчаннямі ўдзельнікаў.

У школьным конкурсе работ даследчага характару прынялі ўдзел 11 навучэнцаў V-IX класаў з 9 работамі. На раённым этапе конкурсу работы адзначаны дыпломам па фізіцы (настаўнік Малашэвіч У.Л.), лістамі падзякі па англійскай мове і біялогіі (настаўнікі Машынскі К.Р., Тупіцына Г.В., Шышла Т.В.), пасведчаннем удзельніка па хіміі (настаўнік Хасяневіч М.І.). Навучэнец VI класа Сакалоўскі Антон з’яўляецца пераможцам восьмай адкрытай краязнаўчай канферэнцыі з міжнародным удзелам “Шлях да вытокаў” у секцыі “Welcom to Belarus”(Дыплом ІІ ступені, настаўнікі Машынскі К.Р., Тупіцына Г.В.).

У першым этапе рэспубліканскай алімпіяды па вучэбных прадметах прынялі ўдзел 149 навучэнцаў, у другім шэсць – 5 па пяці вучэбных прадметах.

Падчас другога этапу рэспубліканскай алімпіяды найлепшыя вынікі паказалі навучэнец VIII класа Тупіга Уладзіслаў – 4 месца, навучэнец IX класа Уласень Арсеній – 5 месца, навучэнка Х класа Рошчына Аліна па рускай мове – 5 месца.

На працягу навучальнага года вялася падрыхтоўка да раённай дыягнастычнай алімпіяды (12 навучэнцаў па шасці вучэбных прадметах). Удзел у алімпіядзе прынялі 10 чалавек. Дыпломамі ІІІ ступені ўзнагароджаны Сакалоўскі Антон, VI клас, па беларускай мове і літаратуры (настаўнік Малашэвіч В.В.), Валько Вячаслаў, VII клас, па матэматыцы (настаўнік Малашэвіч У.Л.), Грыневіч Злата, VIII клас, па біялогіі (настаўнік Шышла Т.В.). На працягу апошніх трох гадоў адсутнічаюць удзельнікі другога этапу рэспубліканскай алімпіяды па англійскай мове, астраноміі і грамадазнаўстве.

Акрамя таго вучні школы прымалі ўдзел у дыстанцыйных і Інтэрнэт-алімпіядах. Дыпломамі ІІІ ступені ўзнагароджаны Ульянка Ганна, V клас, па беларускай мове (настаўнік Бяльковіч А.М.) і Сакалоўскі Антон, VI клас, па рускай мове (настаўнік Асаенка М.Т.).

Навучэнцы ўстановы адукацыі прымалі актыўны ўдзел у конкурсах: раённы конкурс тэхнічнай творчасці “Думаем.Творым. Вынаходзім” (дыпломамі ўзнагароджаны Ермаковіч Пётр, Зікрацкі Іван, Седы Кірыл), раённы конкурс юных чытальнікаў “Жывая класіка” (дыплом у Рошчынай Аліны), раённая алімпіяда па правілах дарожнага руху, раённая алімпіяда па асновах бяспекі жыццядзейнасці “Школа бяспекі”, раённы конкурс “Захоўваем законы дарог”, раённы этап рэспубліканскага праекта для падлеткаў “Бяспечны пераход-2021”. Навучэнец IX класа Ермаковіч Пётр стаў пераможцам раённага і абласнога этапаў спаборніцтваў па ракетамадэляванні. Клуб “Юных выратавальнікаў-пажарных”, які аб’ядноўвае 15 навучэнцаў V-X класаў працуе ва ўстанове адукацыі па распрацаваным і зацверджаным плане і на працягу шасці год прымае ўдзел у абласным палявым лагеры “Юны выратавальнік” і злёце Мінскага абласнога аддзялення Беларускай маладзёжнай грамадскай арганізацыі выратавальнікаў-пажарных. З 15 па 18 чэрвеня 2021 года вучні годна прайшлі ўсе конкурсныя выпрабаванні і занялі 4 месца з 23 раёнаў Мінскай вобласці (кіраўнік Леберт В.І).